# Да пытання паганскай этыкі

**Ці можна казаць пра “паганскую” этыку, якая яна? Якія “паганскія” этычныя каштоўнасці можна вылучыць, і як дастасаваць практычна да цэлага шэрагу буйных сучасных з’яваў?**

## Трынкунас і Ёрк

У гэтым студзені сыходзіць дванаццаць гадоў, як у тагасвет адышоў заснoўнік і ачольнік літоўскай “Рамувы” **Ёнас Трынкунас** (1939-2014). Час узгадаць ідэю, што рупіла яму ніяк не меней за аднаўленне культу старабалцкіх багоў і багіняў. У 1990-я, у часы ўздыму, ён працаваў за ўніверсітэцкага выкладчыка этыкі, і арупленасць пытаннямі этыкі пранёс да апошніх дзён. За колькі тыдняў да свайго адыходу ён скончыў пісаць “Кнігу літоўскай мудрасці”, пра працу над ёй ён натхнёна распавядаў ужо падчас 1-й Балцкай крывулі ў 2011-м.

Яго ўласных падагульненняў там было даволі сціпла – асноўны масіў складалі рупна адабраныя і размеркаваныя па дзевяці тэматычных раздзелах аповеды з вуснай народнай спадчыны. “Чырвонай ніткай” праз усю кнігу праходзіць якраз тэма этыкі, адвечнай маральнасці: што добра і што дрэнна, што рабіць і чаго не рабіць – з гледзішча назапашанага папярэднімі пакаленнямі калектыўнага досведу.

“Кніга літоўскай мудрасці” выйшла на наступны год пасля адыходу яе складальніка, у 2015-м. Надзвычай паказальна, што роўна ў тым жа годзе на Захадзе выходзіць зусім кампламентарная, больш чым 400-старонкавая кніга “Паганская этыка“.

Яе аўтар – вялікі сябар “Рамувы” і заходні акадэмічны навуковец-рэлігіязнавец **Майкл Ёрк** (прозвішча англізаваная з Юркшайціс, так звалі яго дзядулю-эмігранта з Літвы). Перад тым, у 2003-м, ён ужо быў выдаўшы кнігу “Паганская тэалогія”, а менш-больш нядаўна, у 2019-м, выдаў яшчэ і кнігу “Паганскі містыцызм” – і гэта ўсё акадэмічныя выданні, з адпаведным навуковым апаратам, шырокім даследчым гарызонтам і рэцэнзіямі ў паважных выданнях. Сам Ёрк таго ж, што і Трынкунас, 1939-га года нараджэння і ўсё яшчэ жыве.

Скурпулёзнае прачытанне і ахайнае ўвядзенне абедзвюх кніг (а ў выпадку Ёрка – і астатніх ягоных дзвюх таксама) у даследчы ўжытак яшчэ, трэба спадзявацца, наперадзе (“Паганская тэалогія”, зацемім, выходзіла ў літоўскім перакладзе ў 2008-м). Тут жа хацелася б найперш адзначыць, якія каштоўнасці “паганскай этыкі” вылучаюць Трынкунас ды Ёрк.

## Этыка: азначэнне і падыход Ёрка

Паводле фармулёўкі аўтарытэтнай “Брытанскай энцыклапедыі” (на яе, напрыклад, Трынкунас спасылаецца ў сваёй ранейшай кнізе “Шлях старалітоўскай рэлігіі”, калі кранаецца азначэння рэлігіі), *этыка вывучае, што маральна добрае і дрэннае, што маральна правільнае і памылковае, і дастасоўваецца гэтае паняцце таксама да хоць якой сістэмы або тэорыі маральных каштоўнасцяў або прынцыпаў*.

Увогуле, узняццё этычнай праблематыкі для галіны паганскага – безумоўна, новы ракурс, які значна карэгуе і інспіраваны хрысціянствам масавы падыход “паганскае як нешта цемрашальскае / неўтаймаванае / нерэфлексіўнае”, і неапаганісцкі падыход засяроджвання на шматбожжы і адпаведнай цырыманіяльнасці.

Пытанне можа быць пастаўленае так: *што менавіта “паганскага” ўзята ў нашую сучасную рэчаіснасць і як яго пазнаць праз пазнейшыя рэлігійна-этычныя наслаенні*. Бо, як вя-

дома, кожная наступная рэлігія-пераможца ўсё добрае бярэцца асацыяваць з сабой, а ўсё кепскае “аддае” сваёй пераможанай папярэдніцы. Напрыклад, хрысціянства цвёрда намагалася праасацыяваць з паганствам няўмеранасць, няшчырасць, распусту, бездухоўнасць і інш. (і зусім забрала паняцце святасці).

Да галоўных паганскіх “цнотаў” (англ. *virtue*) М. Ёрк залучае такія каштоўнасці, як **Свабода, Камфорт, Здароўе**, і іх ён бачыць не проста “паганскімі”, але і адпачатна-чалавечымі (хочацца дадаць: псіхалагічна спелага і дарослага чалавека). Не беручыся тут параўноўваць гэтага з сучасным заходнім каштоўнасным кантэкстам, ані суадносіць з досыць адрознымі каштоўнасна прадаўнімі “старапаганскімі” часамі, трэба адзначыць, што адзначаныя каштоўнасці найперш стасуюцца сучасных заходніх неапаганістаў, да якіх сябе на старонках кнігі зусім не вагаючыся далучае і аўтар (як піша, мае 30-гадовы досвед). Чацвёртая каштоўнасць, пра якую кажа Ёрк, – **Ушанаванне**, і яе як досыць складаны канцэпт ён падзяляе (як – асобная гаворка) яшчэ на тры: **асалода, плённасць, шчодрасць**. (Як выглядае, такое разуменне ўшанавання мела б вынікаць са страты касмалагізму.)

Зрэшты, няцяжка сабе ўявіць (або прыгадаць, калі хто сутыкаўшыся) такога заходняга паган-аўтанаміста, які не саромеецца ў самавыяўленні і пільна дбае пра свае (і па магчымасці таксама чужыя) асабістыя межы, а таксама нікому і нічому не дае парушыць ціхую раўнавагу свайго стану здароўя – ментальнага і фізічнага. Хіба, нават на Захадзе, як думаецца, даволі тых, хто выбірае для сябе метафару “бэрсэрка”, а не хобіта.

## Трынкунас: сям’я, праца, адгуклівасць

Ё. Трынкунас глядзіць на этычную сферу інакш. Для яго рэферэнтная група – не сучасныя заходнія (непалітызаваныя) неапаганісты, але яшчэ зусім нядаўнія аўтэнтычныя вяскоўцы, якіх ён багата быў абышоўшы ў часе этнаграфічных экспедыцый.

У 7-м раздзеле сваёй “Кнігі літоўскай мудрасці” ён піша: “*Чалавек меркаваў, што ўладкаванне космасу было сямейным, нават нябесныя свяцілы былі членамі сям’і*“, “*У народных песнях мы рэдка знойдзем “чалавека” як такога. Заўсёды гэта будзе бацька, брат або зяць, а жанчына – маці, сястрыца або нявестачка*” (с. 152, 153).

У раздзеле 6-м піша: “*Свет увесьчасна творыцца працай, але праца гэта не толькі механічнае выкананне пэўнага задання. Праца для нашых продкаў была ладам жыцця, што абымаў усю экзістэнцыю чалавека і розныя сферы жыцця. Народныя песні пра работы на зямлі поўныя радасці і гонару за плён працы*” (с. 127).

Гэта важны і не адразу прыкметны момант, калі спасыланне на народную этыку (і яе метафары тыпу “Сонца матуля, Месяц татка”) легітымізуе гэтыя зусім “агульныя” чалавечыя каштоўнасці сям’і і працы, выводзячы іх з-пад крыла хрысціянства (біблійнае “прылепіцца жонка да мужа” або Вебэрава “пратэстанцкая этыка капіталізму”). Мець сям’ю і шчыра працаваць, даводзіць Трынкунас, гэта зусім па-паганску, і неабавязкова ісці “сцяжынай самотніка” сацыяльна і эканамічна. Для таго-сяго гэта будзе вагомае сцвярджэнне.

Цікавейшы 5-ы раздзел у “Кнізе літоўскай мудрасці”, у яго загаловак вынесеныя словы з народнага падання: “Добра робіш – сабе, кепска робіш – сабе”. Да сферы этычнага (у яго папулярным разуменні) тут, як выглядае, падыходзім чым бліжэй. Зрэшты, гэта якраз праява таго “залатога правіла маральнасці”, пра якое і ў Канта знаходзім, і ці не ва ўсіх буйных рэлігіях.

Але менавіта ў паганстве гэты прынцып працінае бадай усё, значна выходзячы за сферу інтэрперсанальнага, міжлюдскага. Напрыклад, у нашай калядцы (з-пад Глыбокага) пяецца: “*Просім божаньку на вячэраньку. / Не столькі з’ясі, як нам больш дасі. / Не столькі вып’еш, як нам больш нальеш*“. Тут бачна, як прынцып абмену зусім прыдаваўся даўнейшым лю-

дзям (і пазнейшым носьбітам таго даўняга падыходу) і ў сферы сакральнага: я складу (таму ці іншаму) богу ахвяру – і ён дасць прошанае мной мне ўзамен, аддзячыць-адгукнецца.

Таму калі ў сферы міжлюдскага гэты прынцып можна назваць зычлівасцю, або добразычлівасцю, дык шырэйшы ўжытак вымагаў бы і шырэйшага паняцця тыпу “адгуклівасць” (хто адгукаецца, той адгуклівы). Сэнс у тым, што водгук, адказ, рэакцыя (а і наступства) заўсёды будзе (тут паказальны аповед у “Кнізе літоўскай мудрасці”, калі *адзін другога аббрэхваў усё жыццё і перад смерцю апошняга прыйшоў выбачыцца, а той кажа пер’е з падушкі развеяць па ветры і тады сабраць, і так жа сама не збярэш назад усіх пушчаных у свет слоў*). І гэта не безумоўная адданасць (індуісцкае ёгічнае “бгакці”), не ідыятычная падпарадкаванасць самадурскай “боскай волі”, але такое даволі “магічнае” стаўленне, калі сыходзяцца два суб’екты (хіба, адзін з іх можа быць мацнейшы, часам значна).

Але на адгуклівасці, трэба думаць, запыняцца не варта. Што яшчэ можа быць (і ёсць) выразным маркерам “паганскага” ў сучасным свеце, навокал нас? паводле чаго можна пазнаць “свайго”, нават калі ён гэтай мысленча-ацэначнай “пароднenасці” і не ўсведамляе сам?

## Прыгажосць, Моц, Мудрасць

Вылучым яшчэ тры характарыстыкі. Калі мы цэнім і адзначаем навокал сябе гэтыя якасці – дык робім гэта зусім у “паганскім” стылі.

**Прыгожае** – гэта візуальнае, і гэта ўвасобленае. Гэта не “па-за светам”, не ва ўяўным “свеце духу”. Прыгожае – гэта гарманічнае (менавіта штосьць згарманізаванае, як даводзяць эксперыментальныя псіхолагі, мы і ўспрымаем за ўласна прыгожае). Гэта і чалавек, і што прыроднае (рэчка цурчыць, сосны пагойдваюцца, полымя закручваецца). Прыкметна, што

ў літоўскай мове *gražu* “прыгожа” пашырылася да зусім ацэначнага значэння “добра, цудоўна, прыемна”. Сярод людзей прыгожае – найперш маладое і здаровае, а значыць імпульсіўнасць можа быць дараваная (таму прыгожым можна ўсё, а непрыгожыя мусяць даказваць). Даўнейшыя грэкі ў нейкі момант пайшлі яшчэ далей, іх паняцце *калакагатыі* мела на ўвазе, што прыгожае знешняе мае адлюстроўваць прыгожае ўнутранае (на зямлю іх апусціў хіба Сакрат, які ў дыялогу “Пір” паказаў, што ўзгадняецца яно не заўсёды).

**Моцнае** – бадай галоўная характарыстыка ў прыродзе. Нам можа гэта не падабацца, мы можам эмацыйна быць на баку слабейшага і пакрыўджанага (або і з’едзенага, патрушчанага) – але нельга адмаўляць таго, што гэта ёсць і гэта непазбежна, і на гэтым, больш за тое, уся жывая прырода збудаваная і трымаецца. Калі мы захапляемся моцай і нават магутнасцю чагосьці або кагосьці – актывізуем вось гэтую вельмі эвалюцыйна даўнюю прыродную праграму. Калі хтось не ўзмацніўся і не ўзмацнеў – дык сам вінаваты, бо неразумны і неабачлівы. Але, вядома, ёсць і ўнутраная моц – як у прускім рэлігійным паняцці *drūvis* “вера, упэўненасць, крэпкі стан перакананасці” (стан, крэпкі як “дрэва”, дуб). Унутраная моц не дае слабавольна бегаць ад аднаго моцнага да другога, а змушае трымацца свайго (і гэта не пра “надсветны” дух, а ўсё яшчэ пра зусім зямную ўнутрыцелавую характарыстыку).

**Мудрае** – гэта і пра высокарэфлексіўнае абыходжанне з уласным жыццёвым досведам, але і пра досвед пакаленняў. Даўней мудрым быў найперш стары, які быў увабраўшы ў сябе мудрасць папярэднікаў, пакаленняў, продкаў. Мудрасць заўсёды не момантавая, не імпульсіўная – яна адсылае да пэўнай ранейшай працягласці. Мудрасць – чалавечая, гэта не “бліскаўка”-інсайт з-пазаду неба, гэта выбар з праверaных часам і досведам рашэнняў папярэдніх сітуацый. Для мудрасці мала нават вычытаць – трэба ўмець дастасаваць, не нашко-

дзіўшы. (З іншага боку, ёсць, вядома, і момантавыя знахарскія ініцыяцыі, але тое асобная гаворка.)

Можна лёгка пераканацца, што для "надсветна" арыентаваных рэлігій гэтыя ўсе тры характарыстыкі не такія важныя, а часам і зусім малаважныя. Сузіранне якогась "духоўнага святла" ім саладзейшае за *красу* прыгажуні (або, хай, прыгажуна) або дзівосную прыродную праяву. *Моцы* (у тым ліку і ў грашовым аспекце, ва ўладным) яны проціпастаўляюць пасмяротную "кампенсацыю" (хтось проста "абудзіць мёртвых да жыцця", а хтось яшчэ і цнатлівых безадмоўных гурый дасць, яшчэ хтось выкіне з кола перараджэнняў). А *мудрасць* нівелююць "божымі" абвешчаннямі, сябе бачачы проста за рэтранслятар. Як бачым, прыгожае, моцнае і мудрае – гэта не такое ўжо і ўніверсальна каштоўнае па свеце. Яны надта зямныя, надта "паганскія", і для аматараў "надсветнага" яны падазроныя. Бо хто гэтымі трыма якасцямі замілоўваецца і іх цэніць – той адкрываецца нечаму старому паганскаму.

Гэтыя тры характарыстыкі так мо' і засталіся б абстрактна выведзеныя, каб не сведчанне блізкай да нас тэрытарыяльна і этнічна старапрускай традыцыі. Паводле храніста С. Грунава, у цэнтральным свяцілішчы прусаў рос вечназялёны дуб, а ў ім выявы трох багоў: пасярэдзіне вогнебароды гняўлівы **Пяркунс**, па баках маладзенькі **Патрымпс** і стары **Паталс**. З апошніх двух Патрымпс рупіўся прыродным ростам, а Паталс быў уладаром свету памерлых. Дык жа гэта ў іх увасобіліся тыя тры каштоўнасці: моц – Пяркунс, прыгажосць і маладосць – Патрымпс, тагасветная мудрасць продкаў – Паталс. Па-за старапрускай прасторай за прыгажосць і маладосць мог адказваць веснавы Аўсень, а за мудрасць і продкаў – падземны Велінас (або, у жаночай іпастасі, Заранка-Аўшра ды багіня Вялёна). Гэта ўсё якраз той выпадак, калі каштоўнасць напрамую ўвасабляецца ў боства (як і любяць рэлігіязнаўцы).

## Натуральнасць і Нашскасць

Прыгожае, моцнае і мудрае – характарыстыкі дастаткова старыя. Адгуклівасць дык увогуле ляжыць у аснове ўзаемадзеяння людзей між сабой і са светам (гэта і своеасаблівы "паганскі імператыў" паводзінаў, заснаваны на абмене). Але наш час прыдае і свае акцэнты. Можам вылучыць яшчэ дзве характарыстыкі, якія дастаткова ясна паказваюць, што чалавек, які да іх прыхільны, хіліцца тым самым у даўнейшы, "паганскі" бок. Мова пра Натуральнасць і Нашскасць.

**Натуральнасць** – гэта калі цэніш тое, што больш прыроднае і менш змененае тэхналогіямі або нават культурай (гэта як выгнуты бурдон дуды можна сабраць з вытачаных паасобку складнікаў, але больш цанілася, калі са знойдзенага выгнутага сука). Калі больш каштоўнае – зробленае майстрам індывідуальна і ў адным асобніку, а не наштампаванае масава. Калі цэніш тое, каб быць увогуле бліжэй да прыроды (лес, вёска, натуральныя прадукты) і быць менш уразлівым да масавасацыяльных і інфармацыйных уплываў. Але ці гэта толькі сучасны эскапізм ад урбанізацыі? З аднаго боку, сапраўды, у прадаўнія часы ад прыроды моцна адсепароўваліся праз культуру (каб не расплысціся, не патануць у ёй, навакольнай). Але з іншага боку – менавіта прырода была "ўвасобленым космасам" (зоры і нябесныя бегі, святыя гаі, сімвалізм рэк і жывёлаў, месца жытла істотаў нябачных). Сваё месца побач з прыродай сучасны чуйны чалавек знаходзіць *паміж* зарэгуляванасцю горада і інтэнсіўнай сімвалізацыяй у старым паганстве.

**Нашскасць** – гэта пра абранне свайго, тутэйшага полюса ў апазіцыі "сваё – чужое". ("Нашскі" – хоць і прызабытае, але ўжыванае слова, у Станкевічавым слоўніку на с. 734.) Супраць распачатай некалі хрысціянствам глабалізацыі франтальна не папрэш (як і супраць урбанізацыі ды тэхналагізацыі), але шторазу можна рабіць свой малы выбар: сваё або чужое, "нашае" або "іхнае". Само паняцце свайго, нашага – гэта, безумоўна, спадчына вельмі старых часоў, яшчэ бадай часоў плямен-

ных, калі пра межы свайго “калектыўнага цела” дбалі так жа ўважліва, як сёння дбаюць пра “персанальныя межы”. Сёння паняцце свайго памалу перабралася з абсягу рэчавага ў абсяг сімвалічнага, знакавага. Гэта значыць, калі штосьці смачнейшае ці прадуктыўнейшае, але зроблена не ў нас, – выберам “не нашае”, але калі ў нашую калектыўную ментальную (ці нават фізічную) прастору ўцягваюць штосьці чужое (какошнік або пакістанцаў) – будзем працівіцца. Можна не надта дакладна ідэнтыфікаваць для сябе, што сапраўды “сваё”, а што сапраўды чужое, – але сам падыход зусім “паганскі”.

## *Дадатак*. Як дастасоўваць

Вылучаныя вышэй – адштурхоўваючыся ад думкі М. Ёрка і Ё. Трынкуна – дзве “тройкі” этычных “паганскіх” арыенціраў (**прыгажосць – моц – мудрасць, адгуклівасць – натуральнасць – нашскасць**) можна дастасоўваць і ў больш пабытавых сітуацыях, ідэнтыфікуючы тых, хто думае (ставячыся, ацэньваючы) па-пагански. Але можна дастасоўваць і да буйнейшых паняццяў і з’яваў (як гэта, дарэчы, робіць у сваёй кнізе і М. Ёрк, у другой яе частцы).

1. **Штучны інтэлект**. Як квінтэсэнцыя ўсіх тэхналогій, гэта штосьці выключна далёкае ад *натуральнасці*, а таму для шмат чаго натуральнага выглядае пагрозлівым. З іншага боку – як і ўсе тэхналогіі, гэта *ўзмацняе* чалавека (робячы яго канкурэнтнейшым), дае яму больш магчымасцяў. Спрэчная толькі сама патрэба ў такой напоўненасці свету моцай, якая часта рознаскіраваная, а часам і без яснай (не кажучы пра высокую) мэты.

2. **Дэмакратыя / дыктатура**. Калі ў меншых супольнасцях (веча, поліс, садовае таварыства), дык дэмакратыя зусім *натуральная*. Але змаштабаваўшы да валатоўскіх памераў – адчуванне “пляча” і супольнага вырашэння губляецца, а поле для інфармацыйных маніпуляцый пашыраецца. Таксама і на між-

народнай арэне (дый вырашаючы многія ўнутраныя пытанні) большая *моц* – у краіны з меншай сегментаванасцю.

3. **Гендар**. Людзі з альтэрнатыўнымі сэксуальнымі ўпадабаннямі фіксаваліся зрэдзьчас нават і ў традыцыйнай вясковай супольнасці, дык жа для невялічкай частачкі людства гэта выглядае за зусім *прыроднае*, хоць і асаблівае ды нетыповае. У вёсцы да такіх людзей ставіліся з разуменнем, не стыгматызуючы, і гэта людскае стаўленне. А што *ненатуральна*, дык гэта ў вялікім маштабе прапагандаваць (або нармалізаваць) “гендарны выбар”.

4. **Імперыялізм**. Малым народам можа не падабацца (і не падабаецца) апанаванне іх народамі вялікімі, але такі закон *прыроды*: слабейшага з’ядуць (як воўк есць зайца). Па сутнасці, у такой этычнай перспектыве, нічога звышнармальнага пры экспансіі *моцнага* на слабога няма. Затое слабы, каб засцерагчыся, мае паводзіцца *мудра* і быць пад бокам у іншага моцнага, тады будзе ўраўнаважана.

5. **Турызм**. Імкненне сузіраць *прыгожае*, пабыць паблізу прыгожага – натуральнае памкненне чалавека. Але масавы (не індывідуальны) турызм суправаджаецца бесцырымоннай інвазіяй *чужога* ў абжытую прастору, калі і практыкі мясцовых жыхароў мяняюцца, і сама “тонкая” характарыстыка месца. Яшчэ інтэнсіўней усё гэта пры больш-менш масавай іміграцыі.

6. **Спажывецтва, матэрыяльнасць**. Чалавеку ўласціва замілоўвацца *прыгожымі* рэчамі, і праз такія рэчы прыгажэе і прастора. Але празмерная заграмаджанасць зацьмявае вочы на ўсё іншае, таму так не мудра. З іншага боку, чым большая моц (магчымасці, уплыў, рэсурсы), тым больш не толькі колькасці, але і якасці рэчаў. Таму – чыя *моц* не расце, процьма рэчаў абцяжарвае (і трэба рэгулярна вызваляцца ад лішняга), а для тых з моцай – рэчы і іх якасць гэта індыкатар моцы.

7. **Эзатэрыка**. Не ўсе з людзей імкнуцца да *мудрасці* (для кагосьці нармальна, як паказвае смаленскае паданне, хіліцца

да багацця або да ўлады), але хто імкнецца, той сёння сутыкаецца са стракатасцю на “рынку” ведаў. Перадачы традыцыйных, правераных часам і пакаленнямі ведаў не дашукаешся, а сучасныя “гуру” збольшага зводзяць у “надсветнае”, далей ад прыроднай *прыгажосці* і яе святасці.

8. **Глабалізм**. З гледзішча таго, хто дзейнічае і выкарыстоўвае глабалізацыю на сваю карысць, – чым больш рэсурсаў і чым большы ахоп, тым большая і *моц*, якую праз гэта можна асягнуць (уплыў, грошы, кантакты). Але для таго, хто працягвае жыць у прасторы сваёй і сваіх продкаў, гэта перайначванне месца і яго характарыстыкаў на адзін, глабальны капыл (уніфікацыя), а значыць прыўнясенне *чужога*.

9. **Індывідуалізм, атамізм**. Клопат толькі пра сябе аднаго можа даваць *прыгожыя* вынікі: і ў асабістым псіхалагічным развіцці, і ва ўдасканаленні знешнасці. Але прасоўванне эгаізму на агульнаграмадскім узроўні – гэта атамізацыя грамадства, падкоп пад калектыўную *моц*.

10. **Фемінізм**. Калі дзяўчына рухавая (актыўная) – гэта паказчык здароўя і маладосці, і гэта *прыгожа* ды вабіць. На Купаллі гурткі дзяўчатаў і мальцаў перакідваліся колкімі прыпеўкамі – але за мэту было зачапіць і прывабіць, стварыць натуральнае напружанне, якое рэзультавалася ў стварэнні параў. Распальваць жа вайну палоў – і непрыгожа (нянавісць уродуе твары), і ненатуральна (далей ад працягу роду), і нямудра (дэматывуе мужчын як ваяўнікоў).

*Sv.*

*Электронная друкаванка.*

*Паводле крыніцы: https://svajksta.com/2026/01/10/etyka/*

*Дата публікацыі: 10.01.2026.*